

Wsparcie finansowe dla rodzin - język białoruski

# Фінансавая падтрымка сем’яў

Выплаты для сем’яў - гэта форма дзяржаўнай падтрымкі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці і апекай над ім. Такія льготы прадастаўляюцца ўсім замежным грамадзянам, якія маюць права працаваць у Польшчы ці вызваляюцца ад абавязку мець дазвол на працу, калі яны пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на працягу перыяду выплат і адпавядаюць устаноўленым законам умовам.

## Такім чынам, выплаты прадастаўляюцца замежным грамадзянам:

1. да якіх прымяняюцца палажэнні аб каардынацыі сістэм сацыяльнага забеспячэння, калі гэта вынікае з абавязковых для Польшчы двухбаковых міжнародных пагадненняў аб сацыяльным забеспячэнні,
2. якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе дазволу на часовае знаходжанне,
3. якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе дазволу на пастаяннае знаходжанне, дазволу на знаходжанне доўгатэрміновага рэзідэнта Еўрапейскага саюза, дазволу на часовае знаходжанне для выканання работы, якая патрабуе высокай кваліфікацыі, або ў сувязі з атрыманнем у РП статуса бежанца або дадатковай абароны, калі яны пражываюць у Польшчы з членамі сем’яў,

4. якія маюць карту знаходжання з паметкай „доступ да рынку працы", калі пражываюць у Польшчы разам з членамі сем'яў, за выключэннем грамадзян трэціх краін, якія атрымалі дазвол на працу на тэрыторыі дзяржавы-члена на перыяд, які не перавышае 6 месяцаў, для грамадзян трэціх краін, прынятых з мэтай вучобы, а таксама грамадзян трэціх краін, якія маюць права выконваць работу на падставе візы.

Заяўкі на атрыманне такіх выплат падаюцца ў раённую адміністрацыю (аддзел сацыяльных спраў і аховы здароўя / выплат) па месцы жыхарства.

## Віды выплат для сем'яў:

**Сямейная дапамога** прадастаўляецца бацькам, аднаму з бацькоў або законнаму апекуну дзіцяці, калі даход сям'і на чалавека не перавышае 674 зл. у месяц. Больш падрабязна аб сямейнай дапамозе чытайце на сайце gov.pl/web/rodzina/zasilek-rodzinny.

Асоба, якая мае права на сямейную дапамогу, можа падаць заяўку на атрыманне дапамогі ў сувязі з:

- навучаннем і рэабілітацыяй дзіцяці з абмежаванымі магчымасцямі,
- пачаткам навучальнага года,
- нараджэннем дзіцяці,
- доглядам за дзіцем у перыяд водпуску па догляду за дзіцем,
- навучаннем дзіцяці ў школе за межамі месца жыхарства,
- выхаваннем дзіцяці адным з бацькоў,
- выхаваннем дзіцяці ў шматдзетнай сям'і.

Інфармацыю пра іх вы знойдзеце на сайце gov.pl/web/rodzina/dodatki-do-zasilku-rodzinnego.

Асобнай групай з'яўляюцца **выплаты па догляду** для кругласутачных апекуноў людзей з абмежаванымі магчымасцямі або саміх людзей з абмежаванымі магчымасцямі.
Інфармацыю пра іх вы знойдзеце на сайце gov.pl/web/rodzina/swiadczenia-opiekuncze.

**Выплата для бацькоў** складае 1000 зл. у месяц і не залежыць ад даходу; гэта сума нетта і не абкладаецца падаткам. Яна прадастаўляецца маці або бацьку дзіцяці, фактычнаму апекуну дзіцяці, прыёмнай сям'і або асобе, якая ўсынавіла дзіця, на працягу ад 52 тыдняў (пры нараджэнні аднаго дзіцяці) да 71 тыдня (пры нараджэнні пяці або больш дзяцей). Заяву на атрыманне выплаты для бацькоў трэба падаць на працягу трох месяцаў пасля нараджэння / ўсынаўлення дзіцяці. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце gov.pl/web/rodzina/wiadczenie-rodzicielskie.

**Аднаразовая дапамога пры нараджэнні дзіцяці ў памеры 1000 зл. прадастаўляецца, калі маці знаходзілася пад медыцынскім доглядам не пазней 10 тыдня цяжарнасці да дня**

**родаў.** Да заяўкі аб устанаўленні права на аднаразовую дапамогу трэба прыкласці даведку, якую можа выдаць лекар ці акушэрка. Заяўка на выплату павінна быць пададзена на працягу 12 месяцаў пасля нараджэння дзіцяці. Больш інфармацыі: gov.pl/web/rodzina/jednorazowa-zapomoga-z-tytulu-urodzenia-sie-dziecka.
Больш падрабязна аб выплатах для сем'яў чытайце на сайце gov.pl/web/rodzina/wiadczenia-rodzinne.

**Дапамога па выхаванню 500+** прадастаўляецца на кожнае дзіця да 18 гадоў і складае 500 зл. у месяц незалежна ад даходу. Каб атрымаць 500+, вы павінны падаць заяўку ў электронным выглядзе ў Службу сацыяльнага забеспячэння. Усе формы (SW-R, SW-O, SW-D) можна падаць праз платформу электронных паслуг (PUE) ZUS. Калі вы маці або бацька дзіцяці і ў вас ёсць нумар сацыяльнага страхавання PESEL, вы можаце падаць заяўку SW-R таксама па адрасе empatia.mpips.gov.pl або праз сайт вашага банка.
Па пытаннях дапамогі па выхаванню вы можаце звярнуцца:

- на гарачую лінію 22 290 55 00 (з панядзелка па пятніцу з 8.00 да 15.00),
- у колл-цэнтр ZUS па нумары 22 560 16 00 (з панядзелка па пятніцу з 7.00 да 18.00).

Падрабязную інфармацыю аб праграме 500+ можна знайсці на сайце https://tinyurl.com/4tpv8fws

**Добры старт** - адзін раз у год вы можаце атрымаць 300 зл. на падрыхтоўку да школы, калі вы бацька або апякун навучэнца:

- ва ўзросце да 20 гадоў,
- ва ўзросце да 24 гадоў (для навучэнца з абмежаванымі магчымасцямі).

Грошы вы атрымаеце незалежна ад даходу вашай сям'і на банкаўскі рахунак, які вы падалі ў заяўцы. Электронная заяўка павінна быць пададзена ў перыяд з 1 ліпеня па 30 лістапада праз сістэму электроннага банкінгу, у PUE ZUS на сайце zus.pl або на партале https://empatia.mpips.gov.pl/. Інфармацыю аб гэтай выплаце можна знайсці на сайце zus.pl/baza-wiedzy/program-dobry-start.

**Сямейны капітал па догляду (RKO)** з'яўляецца дапамогай для сем'яў з дзецьмі-утрыманцамі; яго мэта ў тым, каб часткова пакрыць выдаткі, звязаныя з доглядам за другім і наступным дзіцем ад 12 да 35 месяца жыцця.
RKO не залежыць ад даходу сям'і і складае 12 000 зл. на другога і кожнага наступнага дзіцяці. Бацькі могуць вырашыць, ці хочуць атрымліваць дапамогу ў памеры 500 зл. на працягу 24 месяцаў або ў памеры 1000 зл. на працягу 12 месяцаў.

Заяўку на атрыманне RKO і патрэбныя дадаткі можна падаць толькі ў электронным выглядзе, з дапамогай электроннага банкінгу, у PUE ZUS на сайце zus.pl або на партале https://empatia.mpips.gov.pl/.

Падрабязнасці можна знайсці на сайце zus.info.pl/rodzinny-kapital-opiekunczy-rko.

**Фінансаванне наведвання ясляў**. Вы можаце звярнуцца ў ZUS з просьбай аб зніжэнні платы за наведванне дзіцем ясляў, дзіцячага клубу або знаходжання ў дзённага апекуна. Права на фінансаванне не залежыць ад даходу вашай сям'і.

Вы маеце на гэта права, калі:

- вы з'яўляецеся адным з бацькоў дзіцяці, законным апекуном або асобай, якому суд даверыў апеку над дзіцем, напрыклад, адным з прыёмных бацькоў,
- дзіця наведвае яслі, дзіцячы клуб або карыстаецца паслугамі дзённага апекуна,
- вы не атрымліваеце дапамогу ў выглядзе сямейнага капіталу па догляду за дзіцем.

Фінансаванне складае максімум 400 зл. у месяц на дзіця, але не больш, чым сума платы, якую вы ўносіце за знаходжанне дзіцяці ў яслях, дзіцячым клубе або ў дзённага апекуна.

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце

**https://www.zus.pl/-/dofinansowanie-pobytu-w-zlobku**

Інфармацыю аб сацыяльных дапамогах і выплатах можна знайсці па адрасе gov.pl/web/rodzina/pomoc-spoleczna-dla-cudzoziemcow-na-jakie-wsparcie-w-polsce-moga-liczyc.

**Грамадзяне Украіны да 24 жніўня 2023 года маюць доступ да сацыяльнай дапамогі, дапамогі па догляду за дзіцем, сямейных выплат, дапамогі Добры старт, RKO і зніжэння платы за наведванне дзіцем ясляў, дзіцячага клубу або знаходжання ў дзённага апекуна.**

---

UNIA EUROPEJSKA
FUNDUSZ AZYLU,
MIGRACJI I INTEGRACJI

PFM
POLSKIE FORUM MIGRACYJNE

*Бяспечная гавань*
*(Bezpieczna przystań)*
Праект сумесна фінансуецца Нацыянальнай праграмай Фонду прытулку, міграцыі і інтэграцыі

Fundacja Polskie Forum Migracyjne
ul. Szpitalna 5/14, Warszawa
+48 692 913 993
info@forummigracyjne.org
**www.forummigracyjne.org**

Выключная адказнасць за выказаныя думкі ляжыць на аўтары, і Еўрапейская камісія, а таксама Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі не нясуць адказнасці за тое, як выкарыстоўваецца уступленая інфармацыя.